# Успамінаючы Івана Шамякіна

**Літаратурнае свята «Жыцця пачатак і працяг...», прысвечанае 90-годдзю са дня нараджэння Івана Шамякіна, адбылося ў Добрушскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. У мерапрыемстве ўдзельнічалі прадстаўнікі гомельскага літаратурнага аб'яднання «Пралеска», якое існуе на базе Гомельскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, а таксама народнага літаратурна-паэтычнага клуба «Натхненне» з Добруша.**



На сустрэчы гучалі ўспаміны аб музычных прыхільнасцях пісьменніка. Прысутныя даведаліся, што любімай песняй Івана Пятровіча з дзяцінства была «Распрягайте, хлопцы, коней». Падабаліся пісьменніку і знакамітыя шлягеры савецкай эпохі «Волга-Волга», «Тёмная ночь», «Туманы мои, растуманы». У студэнцкія гады ён палюбіў оперу, асабліва твор Джузэпэ Вердзі «Атэла». Безумоўна, шанавалі ў доме Шамякіна і беларускія песні. А яшчэ цікава, што Івану Пятровічу падабаліся некаторыя рок-кампазіцыі гурта «Арыя».

Удзельнікі мерапрыемства падзяліліся сваімі ўспамінамі аб асабістых сустрэчах з Іванам Шамякіным. Пісьменнік Васіль Ткачоў рассказаў, што яму пашчасціла бываць дома ў Шамякіна і адчуць прастату ў адносінах нашага знакамітага земляка да людзей. «Працаваў Іван Пятровіч ноччу, а потым да трох гадзін дня спаў, – прыгадвае Васіль Юр'евіч. – Казаў мне: "Васіль, усё, што ты пішаш, усё чытаю". Іван Пятровіч шмат таленавітых гомельскіх пісьменнікаў перацягнуў у Мінск. Анатоля Грачанікава, напрыклад. І калі Грачанікава хавалі, Шамякін, ідучы на могілкі, плакаў. Народны пісьменнік разумеў, што значыць згубіць такога таленавітага паэта.

Іван Шамякін быў чалавек дабрэйшай душы: Іван Навуменка, напрыклад, ніколі не атрымаў бы званне народнага пісьменніка, калі б не падтрымка Шамякіна. Часта Івану Пятровічу дасылалі лісты, у якіх прасілі дапамагчы каму-небудзь з творчых людзей. Ён дапамог многім пісьменнікам атрымаць кватэры. А калі я апынуўся на якімсьці банкеце ў Мінску, пасля яго заканчэння Шамякін у мяне па-сяброўску спытаў: "Васілёк, дзе будзеш начаваць?" Я адказаў, што месца для начлегу ўжо знайшоў, і папрасіў не турбавацца».

Распавядаючы пра творчасць знакамітага калегі, Васіль Ткачоў асабліва адмеціў аповесць «Гандлярка і паэт»: «Так удала напісана, па-мастацку зроблена! І яму не далі Ленінскую прэмію за гэту кнігу. Вылучылі на яе ў Маскве і не далі. Знайшлі адмоўны штрых у тым, што пісьменнік зрабіў гераіняй гандлярку. Рабочы павінен быў быць, калгаснік», – скардзіцца Васіль Юр'евіч. Гаворачы аб адносінах Шамякіна да пісьменніцкай працы, Васіль Ткачоў дзівіўся таму, колькі Іван Пятровіч сядзеў у архівах, колькі патрэбна было цярпення для напісання трынаццаці раманаў. «Ён жа, ведаеце, як пісаў? Правая рука ў яго амаль не рухалася. Левай рукой трымаў правую і памагаў ёй пісаць: указальным пальцам левай рукі падпіхваў правую руку з ручкай», – прыгадаў Васіль Юр'евіч. Але нягледзячы на ўсенародную любоў, у знакамітага пісьменніка быў свой творчы боль. Ён крыўдзіўся, што беларускія рэжысёры не ставілі яго п'есы. «Валерый Раеўскі, рэжысёр Купалаўскага тэатра, ніводнай п'есы яго не прачытаў. Ім не давалі ходу, – дзеліцца Васіль Ткачоў. – І Шамякін піша аб гэтым ва ўспамінах».

***Любімай песняй Івана Шамякіна была «Распрягайте, хлопцы, коней». У студэнцкія гады ён палюбіў оперу, асабліва твор Джузэпэ Вердзі «Атэла». А яшчэ Івану Пятровічу падабаліся некаторыя рок-кампазіцыі гурта «Арыя».***

Узгадваў Васіль Юр'евіч і цікавыя моманты, звязаныя з біяграфіяй творцы: «Яму пашанцавала жыць у той час, калі пісьменніка мог вызваць да сябе ў кабінет Машэраў. Шамякін мне казаў, што ў яго было 50 тысяч рублёў на кніжцы, і ён лічыў, што забяспечыў сабе старасць. Але ў час перабудовы ўсе грошы прапалі...»

Паэт Міхась Болсун, у сваю чаргу, рассказаў, што калі ён вучыўся на факультэце журналістыкі, іх групу павялі на адкрыццё сесіі Вярхоўнага Савета БССР. Там ён упершыню і пачуў голас Шамякіна: «Гэта быў удумлівы, разважлівы, пасялянску нетаропкі, не гучны голас і, тым не менш, уся зала замірала. Тады мне спадабалася яго цяга да малой радзімы – у перапынку ён падыйшоў да дэпутатаў з Гомельшчыны і павёў з імі размову». Гэта была першая сустрэча Міхася Міхайлавіча з Шамякіным, а другая адбылася ў 1986 годзе, пасля чарнобыльскай бяды, калі ў Гомельскім аблдрамтэатры Іван Шамякін разам з Барысам Сачанка і Міколам Мятліцкім абмяркоўвалі гэту праблему.

***«Правая рука ў Івана Пятровіча амаль не рухалася. Ён левай рукой трымаў правую і памагаў ёй пісаць: указальным пальцам левай рукі падпіхваў правую руку з ручкай».***

Паэтэса Ніна Шклярава распавяла пра тое, што яна з'явілася на свет дзякуючы жонцы Шамякіна Марыі Філатаўне, якая была медработнікам ў роднай вёсцы Ніны Нічыпараўны і прымала роды ў яе маці. Маленькую Ніну Шкляраву Шамякіны частавалі цукеркамі, а пасля, калі яна сустракалася з Іванам Пятровічам на семінары маладых паэтаў, пісьменнік цёпла ставіўся да яе.

Работнікі бібліятэкі таксама знайшлі, што ўспомніць. «Я была на 80-годдзі Шамякіна ў Мінску, – прыгадала загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Добрушскай цэнтральнай бібліятэкі Святлана Грынчык. – Іван Пятровіч тады сказаў: "Прапагандыстам маёй творчасці я хачу даць слова першым". І я адчула гонар за сваю прафесію. А на фуршэце Іван Шамякін сумна пажартаваў: "Гэта генеральная рэпетыцыя маіх пахарон". Мы яму: што вы такое кажаце, жывіце доўга. А ён у адказ: "Што такое 80 год? Хіба гэта юбілей? Вось у 50 год як ліха мы адплясвалі ў рэстаране. Вось гэта быў юбілей!"»

Напрыканцы сустрэчы Васіль Ткачоў падзякаваў дабрушанам за памяць і павагу да свайго вялікага земляка, які пра адносіны да роднага краю сказаў наступныя словы: «Пісьменнік, які не любіць сваю малую радзіму, ніколі не стане сапраўдным творцам».

**Дзмітрый ЧАРНЯЎСКІ, «ГВ».**
**Фота аўтара.**

## Городская афиша

## КОНЦЕРТЫ, РАЗВЛЕЧЕНИЯ

### Гомельский областной драмтеатр

**8 марта.** М. Задорнов **«ЛЮБОВНАЯ АВАНТЮРА».** *Комедия в двух действиях.*
**9 марта.** Г. Марчук **«ЕЩЁ НЕ ВЕЧЕР!..».** *Комедия в двух действиях.*
**10 марта.** А. Островский **«ВОЛКИ И ОВЦЫ».** *Комедия в двух действиях.*
**11–13 марта.** Р. Куни **«СЛИШКОМ ЖЕНАТЫЙ ТАКСИСТ».** *Комедия в 2-х действиях.*

### Молодёжный театр (74-74-14)

**9 марта.** Э. Радзинский **«Я СТОЮ У РЕСТОРАНА: ЗАМУЖ – ПОЗДНО, СДОХНУТЬ – РАНО».** *Комедия.*
**10 марта.** А. Слаповский **«РОЖДЕНИЕ».** *Комедия-притча в двух действиях.*
**11 марта.** Р. Куни **«№ 13».** *Комедия в двух действиях.*
**12 марта.** М. Ладо **«ОЧЕНЬ ПРОСТАЯ ИСТОРИЯ».** *Пьеса в двух действиях.*
**13 марта.** Н. Гоголь. **«ЖЕНИТЬБА».** *Совершенно невероятное событие в двух действиях.*

### Гомельская областная филармония

**11 марта 18.30.** Белорусский государственный хореографический ансамбль «Хорошки». (ОКЦ, ул. Ланге,17).

### Гомельский государственный театр кукол (77-47-13)

**12 марта.** М. Азов, В. Михайловский **«АВАРИЯ, СТОЙ!».** *Дорожно-транспортный боевик в 2-х действиях. Для детей от 3 лет.*
**13 марта. «НЕВЕРОЯТНОЕ ПУТЕШЕСТВИЕ В СТРАНУ ЧУДЕСНЫХ СНОВ».** *Спектакль-игра в 2-х действиях Для детей от 3 лет.*

### Гомельский дворцово-парковый ансамбль (74-19-11)

#### Центральная часть дворца

**Выставки:**
«Между Гомелем и Италией» – выставка современных художников;
«Реальность и фантазия» – выставка живописи и керамики Петра Фея;
«Масонская коллекция из собрания Вацлава Фёдоровича» – из фондов Витебского областного краеведческого музея;
«Художественное стекло и гобелен» из собрания Музея современного изобразительного искусства (г. Минск).
Выставка белорусского художника В. К. Бялыницкого-Бирули.
«Іван Шамякін. Мае кнігі – мая біягафія» – литературно-документальная выставка, посвящённая 90-летию со дня рождения народного писателя Беларуси И. П. Шамякина.
«Красная гостиная» «Зал торжественных приёмов».
«Культовые предметы» («Домовая церковь», северный ризалит дворца).
«Загадочные фантазии моря» (грот дворца).
Экспозиция, посвящённая государственному деятелю СССР А. А. Громыко.
Экспозиция открытого хранения археологической коллекции музея (цокольный этаж южной галереи дворца).
**9 марта. 18.30.** Концертная программа «Вдохновение души» (романсы, арии из оперетт русских и зарубежных композиторов).

#### Башня дворца

**Выставки:**
«Медицинская литература XIX – первой половина XX в.»;
«Планета радости» – выставка живописи Полины Жуковой.

#### Северное крыло

**Выставки:** Комната кривых зеркал (комната смеха).
«Животный мир Гомельщины».
Уголок живых экзотических рептилий.

#### Зимний сад

Мир субтропических растений и животных.

### Музей истории города Гомеля (Охотничий домик) (74-28-23, 74-67-00)

«Симфония души» – выставка художницы Людмилы Чепкасовой (пейзажи, натюрмотры, миниатюры).
«Основателю алгебраической школы в Гомеле посвящается» – выставка к 106-летию со дня рождения С. А. Чунихина.
«Интерьеры городского особняка конца XIX – начала XX веков».
«Прогулки по Гомелю конца XIX – начала XX веков».
«История Гомеля с древности до начала XX века».
Выставка-продажа произведений изобразительного искусства, сувениров.

### Филиал Ветковского музея имени Фёдора Шклярова (74-10-40, 74-88-87)

«Книга книг – Евангелие» – выставка изданий Евангелия XVII – начала XX века.
«Любили раньше чаёвничать...» – выставка самоваров и чайной утвари.
«Муж. Мужчина. Воин» – выставка икон, представляющих мужские образы.
«Живое ремесло» – интерактивная выставка ткачества.

### Картинная галерея Г. Х. Ващенко (77-75-20, 77-74-12)

Выставка «Гавриил Ващенко».
Выставка-продажа произведений изобразительного искусства, сувениров и товаров для художников.
Выставка авторских кукол Анны Балаш (г. Минск) в сопровождении фотографий Ирены Гудиевской (г. Минск) «Весеннее путешествие».
**9 марта. 16.00.** Открытие выставки живописи Геннадия Тарских.
**С 9 марта.** Выставка «Экзотические и певчие птицы» (попугаи какаду, жако, эквадорский и другие).
**11 марта. 16.30.** Открытие выставки скульптуры А. Воробьёва.
**11 марта. 16.00.** Открытие фотовыставки Виктора Смольского «Осенняя мозаика Клермон-Феррана».

### Гомельский областной музей военной славы (77-60-60)

Выставка «Музей в музее» – предметы из фондов районных музеев области.

### Музей криминалистики

Постоянные экспозиции и выставки.

### Музей редкой книги(77-46-19)

**(Областная универсальная библиотека имени В. И. Ленина)**
«Пережившие века». В основе экспозиции – уникальные книги из библиотеки И. Ф. Паскевича.
«Детское чтение для сердца и разума».
«Вглядываясь в прошлое» – выставка миниатюрных книг.
«Мыслитель, учёный, художник» – выставка посвящённая 170-летию со дня рождения русского историка В. О. Ключевского.
«Белорусская графика».

### Выставочный краеведческий зал библиотеки имени А. И. Герцена (71-65-06, 71-65-01)

«С любовью для вас» – выставка Тамары Дмитриевой, Ирины Даниловой и студентов Гомельского государственного художественного училища(керамика, ткачество, гобелен, батик).
**8 марта.** Открытие фотовыставки Евгения Лимонтова «Цветы и женщины похожи...».

## КИНО

### Кинотеатр имени Калинина (74-37-82)

**7–10 марта. «ЛЮБОВЬ-МОРКОВЬ-3».** *13.30 (сб.вс.). 15.30, 17.30, 19.30, 21.30.* **11–13 марта.** *21.30.*
**11–13 марта. «ИНОПЛАНЕТНОЕ ВТОРЖЕНИЕ: БИТВА ЗА ЛОС-АНДЖЕЛЕС».** *13.30, 16.00, 18.40.*

### Для вас, ребята!

**7 марта. «СОЮЗ ЗВЕРЕЙ».** Мультфильм. *12.00.*
**12–13 марта. «УЧЕНИК ЧАРОДЕЯ».** *11.20.*

### Кинотеатр «Октябрь» (40-80-40)

**7–13 марта. «СУМАСШЕДШАЯ ЕЗДА».** *15.00, 17.00, 19.00, 21.00*
**7–9 марта. «ГНОМЕО И ДЖУЛЬЕТТА»** 3D. *11.30, 13.20. 6-8 марта.*
**12-13 марта.** *доп. сеанс 10.20.*

### Кинотеатр «Юбилейный» (60-74-95, 57-56-69)

**7–13 марта. «ЗЕЛЁНЫЙ ШЕРШЕНЬ» 3D .** *15.00, 17.20.*
**7–8, 12,13 марта. «ТРИ БОГАТЫРЯ И ШАМАХАНСКАЯ ЦАРИЦА» 3D.** *11.30, 13.00.*
**7–13 марта. «БОЛЬШЕ ЧЕМ СЕКС» 2D.** *19.30, 21.30.*